## Падарожжа на востраў ведаў

### Пазакласнае мерапрыемства ў 6 класе

**І. С. Шаламіцкая,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
Сярэдняй школы № 9 г. Пінска

Пазакласнае мерапрыемства накіравана на павышэнне цікавасці да вывучэння беларускай мовы і літаратуры, гісторыі краіны. Дадзенае мерапрыемства праходзіць у гульнёвай форме. Гульня стварае магчымасць эфектыўнай арганізацыі ўзаемадзеяння настаўніка і вучня, з'яўляецца больш прадуктыўнай формай зносін, дапамагае зрабіць працэс навучання цікавым і займальным, падтрымлівае і павышае цікавасць да прадмета. Гульня як сродак навучання валодае матываванасцю на навучанне, адсутнасцю прымусу.

**МЭТА**: папулярызацыя беларускай мовы і літаратуры

**Задачы**:

- ✓ пашырыць цікавасць вучняў да вывучэння беларускай мовы;
- ✓ развіваць камунікатыўную культуру вучняў, уменне працаваць у групах;
- ✓ садзейнічаць выхаванню павагі, любові да роднай мовы і культуры.

**Абсталяванне**: малюнак карты вострава, маркеры, папера А4, ватманы А2, канверты для заданняў, клей, малюнкі з краявідамі Беларусі, эмблемы каманд (васількі і рамонкі), заданні групам, выявы прадметаў: бліны, яйка, кветка-папараць, хвойнае дрэва, сноп жыта.

### ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА

*Мова родная… Беларуская.*
*Ты мая назаўсёды любоў.*
*Не ў лясочку сцяжыначка вузкая,*
*А прасторы жытнёвых палёў…*
*Ахіне ветрык вольнымі словамі –*
*І ў душу завітае святло…*
*А ці сталі б народам без мовы мы,*
*Каб на свеце яе не было*?

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Слова настаўніка**.

Мы жывём у прыгожай краіне, якая горда называецца Беларусь. Яна ў нас адна. Самая родная, самая блізкая і самая незвычайная. Нехта скажа: “А што ў нашай краіне незвычайнае і асаблівае?”

І ў адказ пачуе: “Мы ў свеце не адны. Многа агульнага ў нас з іншымі народамі. Але Беларусь – адна. Адметная сваёй прыродай, гісторыяй, культурай і традыцыямі. І мовай. Багатай і зразумелай, мілагучнай і спеўнай, празрыстай і звонкай.

3. **Работа з эпіграфам.**

А які адказ дасце вы на пытанне аўтара?

(Вучні прапануюць свае адказы, настаўнік падагульняе)

4. **Паведамленне тэмы, пастаноўка задач.**

Сёння мы адправімся ў цікавае падарожжа па краіне Беларускай Мовы і пабываем на востраве Ведаў. Каб не збіцца са шляху, у дарогу мы возьмем карту, дзе будзем адзначаць прыпынкі. Адправімся на караблі, які называецца “Юны мовазнавец”. Нас чакае шмат выпрабаванняў, якія вы лёгка пераадолееце, калі ўважлівыя слухачы,

стараныя вучні і добрыя людзі. За правільныя адказывы будзеце атрымліваць фішкі: поўны адказ – зялёная фішка, няпоўны – жоўтая.

5. **Прадстаўленне каманд і журы.**

1 каманда – “Рамонак”.

2 каманда – “Васілёк”.

Журы – запрошаныя госці, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры

6. **Размінка.**

Каб трапіць на карабель, трэба справіцца з невялікай перашкодай – адгадаць загадкі (хто хутчэй)

(Настаўнік чытае загадкі, каманды адгадваюць)

1) Якое слова складаецца з 3 складоў і ўказвае на 32 літары? (азбука, алфавіт)

2) Чорныя, крывыя, ад нараджэння ўсе нямыя, а як стануць дружна ў рад – усе і загавораць? (літары)

3) Зямля белая, а птушкі на ёй чорныя? (папера і літары)

**7. Асноўная частка**

Вось мы трапілі з вамі ў акіян Прывітальны.

**Першы прыпынак – “Прывітальны”**

Заданне: уставіць патрэбныя па сэнсе словы

(заданне ў канвертах)

Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей раніцай…
І апоўдні …
Увечары пры сустрэчы знаёмым сказаць …
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым людзям…
(В. Вітка)

Наш караблік трапіў у праліў Народны каляндар. Тут нас чакае **другі прыпынак – “Беларускі народны каляндар”**

Камандам раздаюцца лісты паперы А2 і выявы прадметаў. Заданне: вызначыць, атрыбутамі якога свята з’яўляюцца наступныя прадметы:

бліны, яйка, кветка-папараць, хвойнае дрэва і сноп жыта.

Каманды наклейваюць на ліст А2 выявы прадметаў і побач падпісваюць назву свята, затым вывешваюць на дошку.

**Трэці прыпынак – “Аматары беларускага фальклору”**

Наступнае заданне звязана з веданнем беларускіх прыказак. Я хацела іх вам зачытаць, але нейкі шкоднік іх разрэзаў і пераблытаў. Ды я ўпэўнена, што для вас гэта не праблема – злажыць іх правільна. Адну прыказку трэба патлумачыць.

На заданне адводзіцца толькі 3 хвіліны.

**Чацвёрты прыпынак – “Загадкі-жарты”**

(Камандам па чарзе зачытваюцца загадкі)

**1.** Пад імі блытаюцца, калі замінаюць; іх бяруць у рукі, калі хутка ўцякаюць; іх не чуюць пад сабою тыя, хто бяжыць (ногі).

**2.** У няўмелага, нязграбнага чалавека яны дзіравыя; у таго, хто схільны да крадзяжу – доўгія; у майстра – залатыя; імі нават можна заграбаць жар, калі яны чужыя (рукі).

**3.** Ён гладка ходзіць у таго, хто ўмее лёгка і прыгожа гаварыць, і заплятаецца ў чалавека, які невыразна гаворыць (язык).

**4.** За яго можна вадзіць, з ім можна застацца, калі падмануць, ашукаюць. Ім можна кляваць (нос).

**5.** Бессаромны чалавек пазычае іх у сабакі, на іх іншы раз лепей не паказвацца, з іх могуць сыпацца іскры (вочы).

**6.** Міма іх можна ўсё прапускаць, яны могуць завянуць, за імі можа трашчаць (вушы).

**7.** Яе можна малоць у ступе, па ёй можна пісаць віламі, з яе можна выйсці сухім (вада).

**8.** Перажываць, шкадаваць з прычыны чагосьці няздзейсненага, непапраўна страчанага – кусаць (локці).

**Пяты прыпынак – "Чароўны цыферблат"**

Замест лічбаў на гэтым цыферблаце стаяць літары, а лічбы размешчаны ўнізе. Паспрабуйце разабрацца ў лічбах, і вы прачытаеце імёны і прозвішчы вядомых людзей.

Кожная каманда атрымлівае асобнае заданне. На выкананне адводзіцца 3 хвіліны.

**Шосты прыпынак – "Літаратурны"**

Заданне: узнавіць прапушчаны радок, назваць аўтара і твор.

**Сёмы прыпынак – "Кожны з нас у душы паэт"**

Вам даецца лісток паперы з апошнімі словамі верша. Ваша задача – узнавіць верш, уставіўшы неабходныя словы (прыдумаць)

------------------------------ не спяшаюся,
-------------------------------стараюся.
-------------------------------у здабытку,
-------------------------------у сшытку.
-------------------------------Якуб Колас
-------------------------------голас.
--------------------------------чытач,
--------------------------------чытаць.

**Восьмы прыпынак – "Шыфроўка"**

З дапамогай лікаў зашыфраваны прыказкі пра веды і кнігу. Лікі адпавядаюць парадкаваму нумару літар у алфавіце.

Кожная каманда атрымлівае сваю шыфроўку. Расшыфроўвае і запісвае ў клеткі з лікамі патрэбныя літары.

**8. Падвядзенне вынікаў.**

**9. Рэфлексія.**

Калі вы згодны са мною, то сваімі кветкамі ажывіце карту нашага вострава. Вучні прымацоўваюць на карту свае эмблемы: рамонкі і васількі.

**10. Заключнае слова настаўніка.**

Любіце свой край. Кожны дзень адкрывайце для сябе няўлоўную прыгажосць роднага куточка. Прыслухоўвайцеся да нашай пявучай мовы. Заўважайце дабрыню, адкрытасць, таленавітасць нашага народа. І вы адчуеце ў душы вялікі гонар за сваю Радзіму.

**11. Слова журы для ўзнагароды пераможцаў.**

**Літаратура**

1. Кажура, В.В. І загучала слова /В .В. Кажура. – Мінск: Беларус. асац. "Конкурс", 2016.